## *Архітэктурнае мінулае Сеннешчыны*

### *Замак Сянно*




"Замак" малюнак вучня 10 класа з мастацкім ухілам СШ №2
Гарбачова Кірыла

На тэрыторыі, дзе зараз размешчаны фізкультурна-аздараўленчы комплекс, некалі стаяў замак, пабудаваны ў 1573 г. Ен высіўся на ўзгорку, які гараджане называлі Замкавай гарой. Абапал узвышша быў выкапаны роў, запоўнены вадой, што паступала з рэчкі. Цераз роў быў перакінуты пад'емны мост, а на гары ўзвышаўся двухпавярховы дом-палац. У ім жыў уладальнік Сянно Дзмітрый Сапега, адзін в самых багатых людзей Вялікага княства Літоўскага.

Вось што піша аб збудаванні І. Слюнькова ў кнізе "Архітэктура Верхняга Падняпроўя": "Замак Сянно, заснаваны Дзмітраком Сапегам, уяўляе з сябе комплекс, падобны класічнаму ўзору ў трактатах XVI – XVII стст. "палацца-інфортэцца", дзе палацавыя збудаванні самі па сабе былі пазбаўлены абарончых функцый, але абводзіліся сістэмай фартыфікацыйных збудаванняў. Сенненскі панскі дом з двума флігелямі займаў сіметрычнае становішча на квадратнай плошчы 80х80 м, абведзены па перыметру глыбокім ровам, запоўненым вадой. Двума мастамі ўздоўж папярэчнай асі замак з аднаго боку быў звязаны з выраўненым берагам возера, з другога – з жывапісным берагам става, штучна створанага на рэчцы, што ўпадае ў возера. Планіровачная сувязь замка з пасадам трымалася з дапамогай вуліцы-маста, якая ішла ад вугла Замкавай плошчы да рынку".



PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

У тыя гады наш горад знаходзіўся на вялікіх шляхах ваенных сутычак паміж Вялікім княствам Літоўскім і Маскоўскай Руссю, а затым – паміж Рэччу Паспалітай і рускай дзяржавай.

Вось таму і паставіў тут свой замак Дзмітрый Сапега.

У часы Паўночнай вайны 1700 – 1721 гг. шведскія войскі з абозу генерала Левенгаўпта ішлі з Рыгі да Чарэі на злучэнне в войскамі свайго караля Карла XII. Менавіта яны разрабавалі і разбурылі замак Сянно, які пасля гэтага так і не аднаўляўся. У тыя часы дарога ад замка і капліцкі не ішла так, як зараз. Яна рабіла паварот управа "на кручку", дзе тады стаяў вадзяны млын, з дапамогай якога падтрымліваўся ўзровень вады ў замкавых равах. Далей дарога паварочвала на Балонню і пад вялікім вуглом узнімалася на гандлевую плошчу.

Калі пачалі будаваць прамую дарогу на Касцелку, то замкавую гару давялося зруйнаваць і з яе зямлі рабіць падсыпку. Неабходнасць у такой дарозе ўзнікла пасля таго, як з'явілася чыгуначная станцыя Багушэўская ў 1903 г. Трэба было злучыць яе дарогай з Сянно.

***Драўляная царква ў в. Буй***




"З часоў ліцвінаў" малюнак вучня 11 класа з мастацкім ухілам СШ №2
Піткевіча Андрэя

Нажаль у сучасны час царква не існуе, з-за старасці прыйшла ў заняпад і амаль што разбурылася ўшчэнт з-за людскога недагляду і абыякавасці.

Царква ў старажытнай в. Буй (што азначае адкрытае, віднае месца) адносіцца да найстаражытнейшых прыкладаў драўлянага культавага дойлідства Беларусі часоў ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Яна мела ўнікальны архаічны выгляд і пабудавана ў 1665 г. Магчыма на яе месцы была яшчэ старажытнейшая царква, выгляд якой не



PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

захаваўся. Драўляны будынак царквы падзелены на тры роўныя часткі. Цэнтральнае месца займае зала ў выглядзе велізарнага чатырохкутнага аб'ему кубавай формы. Над сценамі якога ўзвышаўся чатырохскатны дах, пераходзячы ў васьміgranны з невялікім барабанам і купалам у выглядзе цыбуліны. Бабінец і апсіда былі значна ніжэй і ўяўлялі сабой выцягнутую прамавугольную пабудову. Сцены галоўнага аб'ему былі прарэзаны вялікімі чатырохкутнымі вокнамі са шматячэістымі рамамі. Па цэнтру, на два бакі галоўнага аб'ему, былі прарэзаны дзверы, упрыгожаныя трохвугольным франтонам. Дзверы і вокны мелі простыя ліштвы. А вось бабінец і апсіда ўпрыгожваліся рамбічаскімі вокнамі. Звонку напэўна ў канцы XIX ст. будынак царквы быў абшаляваны ў выглядзе "драўляных канэлюр".

Званіца відаць не захавалася. Яна магчыма стаяла асобна, побач з царквой.

Царква ўяўляла сабой унікальны помнік драўлянага народнага дойлідства Беларусі часоў Рэчы Паспалітай. Вядома яшчэ і тое, што в. Буй адносіцца да найстаражытнейшых паселішчаў людзей на тэрыторыі Сенненскага раена. Менавіта тут размяшчаўся цэнтр даволі вялікага панскага маентка Палонная (заснавальнік князь Андрэй Уладзіміравіч Альгердавіч, брат князя Алелькі, меў герб у выглядзе трызубца. Яму належалі маенткі Палоннае і Лемніца. Пахаваны ў Кіеўска-Пячорскай лаўры).

## *Касцел св. Троіцы ў г. Сянно*
## (1768 – 1772)



"Касцел св. Троіцы"
малюнак вучня 10 класа
з мастацкім ухілам СШ №2
Няфедава Аляксея


Касцел св. Троіцы ў Сянно. Фота 1907 г.

Архітэктар Іаган Вільгельм Фрэзэр.



PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

У 1609 г. для канвентуальных францысканцаў Яўстафіем Курчам у Сянно быў фундаваны касцел. Ен насіў імя Францызска Азсізскага, заснавальніка ордэна. У 1772 г. пры актыўным удзеле новых уладароў горада, прадстаўнікоў княжацкага роду Залуцкіх-Агінскіх, Тадэвуша і Ядвігі драўляны будынак касцела быў заменены на цагляны і асвечаны ў гонар Святой Троіцы. У гэтым жа годзе па іх хадайніцтву з Рыма сюды былі перанесены мошчы Святога Фартуната. Дазвол на гэта быў атрыманы ад папы Рымскага Кліменція XIV. У 1809 г. з заходняга боку касцела быў вымураваны новы жылы будынак манастыра. Кляштар у той час з’яўляўся асяродкам культуры, меў багатую бібліятэку, пры ім была адкрыта першая ў Сянно школа.

Але час мяняецца. На Беларусі запанавалі ўсходнія вятры. У выніку антыкаталіцкай палітыкі рускага царызму, што ўзмацніліся пасля нацыянальных вызваленчых рухаў на Беларусі ў 1863 – 1864 гг., вялікая колькасць кляштараў была скасавана. Вымушаны былі пакінуць Сянно і францысканцы. Касцел перайшоў да епархіяльнага духавенства ў складзе Магілеўскай рымска-каталіцкай архідыцэзіі.

Трагічнымі для сенненскага касцела аказаліся 30-я гг. нашага стагоддзя, вайна, пасляваенны перыяд. Касцел працаваў да 1937 г. Праўда, у апошнія гады яго работы ксяндза выгналі з жылога будынка кляштара і ен жыў дзесьці на вуліцы Пралетарскай. Разрабаваны і пашкоджаны ваеннымі дзеяннямі і атэістычным вандалізмам, выкарыстоўваемы як склад, храм – унікальны помнік гісторыі і культуры – канчаткова быў знішчаны 17 верасня 1962 г. Калі не дапамагла тэхніка, па загаду кіраўніцтва райкама тагачаснай КПБ былі вызвалены ваенныя саперы, якія ўзарвалі будынак. “Пачуўся глухі гул, касцел прыўзняўся крыху ўверх і тут жа асеў. Цагельныя асколкі нікуды не паляцелі. У самых блізкіх дамах засталіся шыбы ў вокнах…”.

Сенненскі касцел уяўляў з сябе сапраўды рэдкі па прагажосці, адзін з лепшых прыкладаў мастацтва сталага барока не толькі на Беларусі, але і ва ўсей Еўропе. Ен быў своеасаблівай візітнай карткай горада і служыў выдатным арыенцірам для тых, хто яго наведваў. Здалек быў бачны велічны белы сілуэт пабудовы, што ўзвышалася над возерам.

У першую чаргу ўвагу да сябе прыцягваў галоўны, арыентаваны амаль строга на поўнач фасад. Тыповыя, найбольш характэрныя элементы стылю ў ім спалучаліся ў даволі арыгінальную кампазіцыю, якая не сустракаецца ні ў адным з вядомых прыкладаў айчыннай культавай архітэктуры.

Аснову кампазіцыі складалі тры ярусы: першы з іх з галоўным нефам (зала на шырыню амаль усяго касцела) пераходзіў у больш вузкі, своеасаблівы атык, над якім, у сваю чаргу, узвышалася арыгінальная вежа, завершаная шлемам з крыжам. Ствараемае такім чынам ураженне імкнення ў вышыню падкрэслівалася групамі калон першага і другога ярусаў. Апошні быў абрамлены валютамі, размешчанымі над верхам да яго плоскасці і завяршаўся крывалінейным разарваным франтонам, што рабіла сілуэт усяго будынка асабліва выразным і дынамічным.

Кампазіцыйны і ідэйны цэнтр складаў размешчаны над высокім лучковым аконным праемам першага яруса трохвугольны паўразарваны франтон з сімвалам Святой Троіцы. Вокам Апекі Боскай у трохвугольніку ў абрамленні промняў з’яўляўся маляваны вобраз з выявай Хрыста па сярэдзіне атыка.



PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Своесаблівым кантрастам гэтай узнесласці і тыпова барочнай патэтыкі былі строгія і простыя бакавыя фасады, тарцы трансепта і прэсбітэрыі. Тым не менш, карнізы і аконныя праемы аднолькавай формы з тымі элементамі галоўнага фасада, а таксама звязкі і групы пілястраў, што былі адпаведнікамі калон, аб’ядноўвалі іх стылістычна. Невялічкая званіца над алтарнай часткай і завяршэнні тарцоў трансепта, увянчаныя крыжамі, падкрэслівалі гэтае адзінства. Інтэр’ер касцела быў падзелены чатырма слупамі на тры нефы.

Галоўны неф у цэнтры плана перасякаўся з трансептамі і пераходзіў у доўгі прэсбітэрый.

На перакрыжаванні іх скляпенняў знаходзіўся вялікі купал, схаваны пад дахам. Утвораная такім чынам прастора напаўнялася святлом праз высока размешчаныя вокны і выклікала ўзнеслыя думкі і пачуцці. Уражанне ўзмацнялася роспісам купала, фігурамі анелаў на слупах, скульптурай у алтарах. Прыцягвалі ўвагу жырадоль, упрыгожанні з каштоўных матэрыялаў і амвон з правага боку прэсбітэрыя. Над уваходам знаходзіўся арган, гукамі якога напаўняўся касцел у час набажэнстваў. Роспіс касцела ў пачатку XX ст. зрабіў вядомы мастак Вацлаў Бубноўскі.

На вялікі жаль, сення гаварыць аб безумоўна высокіх мастацкіх вартасцях сенненскага касцела можна толькі на падставе захаваўшыхся здымкаў і ўспамінаў тых, каму пашанцавала бачыць храм у поўнай яго прыгажосці. Адно можна сцвярджаць з упэўненасцю – разам з ім наш горад, уся гістарычная і культурная спадчына Беларусі страцілі адну з самых дарагіх каштоўнасцей.

### *Жылы корпус францысканскага кляштара ў г. Сянно*




“Сведка памяці” малюнак вучня 11 класа
з мастацкім ухілам СШ №2
Гарбачова Кірыла



Выгляд самага старажытнага мураванага
будынка ў г. Сянно – былога жылога корпуса
францысканскага кляштара пры касцеле.
Фота 1998 г.

Францысканцкі ордэн быў вядомы яшчэ ў 1223 г. У 1517 г. яго члены раздзяліліся на канвентуальных (чорных) і бернардзінцаў (карычневых), ад якіх пазней, у 1525 г., аддзяліліся капуцыны (вострыя капюшоны).



PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

У 1772 г., калі быў заснаваны кляштар, яго канвент складаўся з 16 чалавек: дзесяці святароў, чатырох клірыкаў, двух братоў (без пасведчання). Яны адкрылі першую ў Сянно школу, у якой навучаліся толькі хлопчыкі. Сярод манахаў, якія былі і выкладчыкамі, было шмат высокаадукаваных людзей. У прыватнасці, у Сянно жыў некаторы час і выкладаў у школе бернардзінцаў Жэра Караль. Ен быў аўтарам зборніка беларускіх, польскіх і лацінскіх анекдотаў “Торба смеху”, у які было ўключана шмат пацешных і павучальных гісторый, што здараліся ў розных мясцінах Сенненшчыны. Францысканцы жылі спачатку ў драўляным будынку, а потым, у 1809 г., пры касцеле быў пабудаваны цагляны кляштар. Ен захаваўся да гэтага часу і зараз з’яўляецца самым старажытным мураваным будынкам у горадзе.

Пасля Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі кляштар выкарыстоўвалі пад казармы часцей асобага прызначэння па барацьбе з бандытызмам. Потым ен быў Домам селяніна і на ім красавалася шыльда “Трохполле – загуба шматполлю”, якую намаляваў мясцовы мастак. Размяшчаўся ў гэтым будынку яшчэ да вайны і ваенкамат. У час вайны ен быў часткова разбураны, а потым выкарыстоўваўся як склад райспажыўсаюза, а зараз – каўбасны цэх. Былы кляштар – адзіны старажытны будынак гандлевай плошчы горада, якая, дарэчы, у 30-я гады нашага стагоддзя насіла імя Урыцкага і была ў той час самай люднай.

### *Праваслаўная царква ў в. Обаль*




“Адзіны напамін” малюнак вучня 11 класа
з мастацкім ухілам СШ №2
Кыцева Геннадзя

Яркім прадстаўніком драўляных архітэктурных помнікаў на тэрыторыі Сенненшчыны з’яўляецца адзіны захаваўшыся на тэрыторыі раена, у в. Обаль (каля Машкан), будынак праваслаўнай царквы. Калісьці, да рэвалюцыі, на тэрыторыі Сенненскага павета было 57 культавых помнікаў архітэктуры, захаваўся толькі



PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

адзін у паўразбураным выглядзе. Гэта праваслаўная царква пабудаваная з дрэва ў класічным стыле, так званая “мураёўка”. Царква пабудавана ў маентку памешчыка Паўла Бурага напрыканцы XIX ст. (1899). Аб’ем будынка складаецца з наступных частак. Першае: бабінец з трохвугольнымі франтонамі і даволі высокай званіцай. Другі паверх званіцы прарэзаны чатырма шырокімі вокнамі. Тут размяшчалася званіца са званамі.

Над чацверыком званіцы ўзвышаўся трэці, глухі паверх званіцы ў выглядзе васьмерыка з купалам-цыбулінай. Над купалам узвышаўся праваслаўны васьміканцовы крыж. Купалы і дахі царквы былі адбіты жэсцю і пафарбаваны ці ў зялены, ці ў блакітны колер.

Бабінец злучаўся з дзяцінцам з дапамогай перахода складанай формы. Дзяцінец (галоўны аб’ем) меў чатырохграную форму і быў самы шырокі па прасторы. Над ім узвышаўся невялікі 12-граны барабан з невялікім купалам цыбуліны. Над купалам існаваў праваслаўны васьміканцовы крыж. Апсіда царквы мела выгляд чатырохкутніка і была даволі значнай па аб’ему. Сцены царквы прарэзаны звычайнымі чатырохкутнымі вокнамі з простымі налічнікамі. Ваконыя рамы былі шматячэістай формы: шасцірадныя ў вышыню і чатырохрадныя ў шырыню, так як ў тыя часы выкарыстоўваліся невялікія кавалкі шкла (з-за дарагавізны і дасціпнага ўжывання).

На прыкладзе гэтай царквы можна ўявіць сабе, як у пачатку XX ст. аздабляліся звонку драўляныя храмы Беларусі. Шалёўка ў елачку і разбіўка на канэлюры. Па ўсяму перыметру сцены аздоблены доскамі шалеўкай. На месцы стыка двух дасок прабівалася трэцяя, якая выступала, такім чынам утваралася як бы канаўка, якую зверху перакрывала карнізная даска з паўкруглымі выразамі.  Такім чынам на паверхні сцяны ўтваралася гульня святла і цені, падкрэслівалася жывапіснасць будынка.

Пасля рэвалюцыі ў памяшканні царквы размяшчаўся клуб, потым зернасховішча, зараз яна знаходзіцца ў паўразбураным стан, без званіцы. Будынак царквы патрабуе неадкладнага рамонту і рэстаўрацыі.

### *Мікалаеўскі сабор у г. Сянно*




“Мікалаеўскі сабор”
малюнак вучня 10 класа з мастацкім ухілам СШ №2
Васіленка Мікалая



Мікалаеўскі сабор. Фота 1907 г.



PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

З сярэдзіны XIX ст. у гарадах і мястэчках Беларусі масава сталі будаваць праваслаўныя цэрквы, празваныя па прозвішчу вядомага генерал-губернатара “мураўеўскімі”. Яны ўзводзіліся па тыповых праектах узораў рускага дойлідства XVII ст. у псеўда-рускім стылі.

Мікалаеўская царква таксама была пабудавана ў гэтым стылі і стала галоўным храмам горада, які называлі Саборам. Крыжова-купальнае збудаванне мела пяць купалоў. Структура храма складалася з узаемнага перасячэння двух цыліндрычных нефаў, перакрытых крыжовымі скляпеннямі. У сярэдзіне перакрыжавання скляпенняў узнімаўся купал – цыбуліна з круглым вялізным васьміаконным барабанам. Па абодвух баках нефаў знаходзіліся званіцы ў выглядзе вежы з галоўкамі-купаламі.

Кожная званіца выглядала як чатырохграннік, па абодвух баках якога знаходзілася па адным асобным праеме. Усе аконныя праемы былі зроблены ў выглядзе выгнутых паўцыркульных арак, над якімі размяшчаліся круглыя аконныя праемы-люкарны. Сцены званіц і нефаў былі ўпрыгожаны пілястрамі. Вежы званіц мелі тры ярусы, абмежаваныя карнізамі.

Трэці ярус званіц уяўляў з сябе вежачкі-чатырохграннікі са скошанымі вугламі і шырокімі арачнымі праемамі з чатырох бакоў. У іх знаходзіліся званы. Вежачкі мелі завершаныя купалы ў выглядзе цыбулін.

На ўзроўні вежачак у сярэдзіне перакрыжаванняў нефаў узвышаўся барабан круглай формы з васьмю аконнымі праемамі, а пад ім – купал-цыбуліна складанай формы.

Пярэдні фасад будынка выходзіў на вуліцу Ветраную (цяпер Кастрычніцкая). З правага боку царквы ў 1889 г. была збудавана каменная каплічка ў памяць аб шчаслівым выратаванні імператарскай сям’і 17 кастрычніка 1888 г., калі народавольцы на Харкаўскай чыгунцы спрабавалі забіць Аляксандра III. Царква была агароджана драўляным плотам з цаглянымі слупамі. З левага боку ад Сабора знаходзілася крама для гандлю свечкамі і кнігамі духоўнага запавету.

Аб унутранай пабудове храма амаль нічога не вядома. Засталіся толькі звесткі, што “между иконами в Соборе обращает на себя внимание изящная икона святого благоверного князя Александра Невского в крашенном киоте, присланная в дар Государем-Императором Александром III после первого покушения на его жизнь в 1866 году. В Соборе тщательно сохраняется и дароносительница, полученная от государя на вечное поминовение души умершего цесаревича великого князя Николая Александровича” (К.Т. Аникиевич. Сенненский уезд).

У царкве стаялі скульптуры Аляксандра Неўскага і Дзмітрыя Данскога, створаныя майстрам Карпам з Ульянавіч.

Мікалаеўская царква знаходзілася ў самым цэнтры горада, на месцы сучаснай СШ №2. У 1934 г. па загаду Сенненскага райкама партыі бальшавікоў яна была разабрана па цаглінцы (за работу ў дзень плацілі 3 рублі). З тых цаглін у 1935 г. сталі будаваць Дом культуры, які стаіць да гэтага часу.

На месцы царквы быў разбіты парк, пастаўлены лаўкі і помнікі У.І. Леніну, І.В. Сталіну, якія стаялі там да 1941 г. Парк таксама не прыжыўся. У 1961 г. на пустэчы была збудавана школа.



PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

## *Пакроўская царква ў г. Сянно*




"Пакроўская царква" малюнак вучня 10 класа з мастацкім ухілам СШ №2 Гарнака Яўгена



Пакроўская царква ў Сянно. Фота 1907 г.

Пакроўская праваслаўная царква была драўлянай. Яе збудаваў Ксаверый Войцехавіч Пуслаўскі – адзін з уладароў горада. Царква была пабудавана ў народным драўляным стылі з рысамі класіцызму. Гэта быў прыходскі храм, які стаяў у планіровачным цэнтры горада і прызначаўся для вясковага насельніцтва павета, бяднейшых слаеў.

Царква ўяўляла з сябе трохзрубны храм, выцягнуты восевай кампазіцыяй з двума купаламі.

Ва ўсю даўжыню будынка ішоў неф, які ўпоперак перасякаўся з другім нефам – трансептам. Далей ішла апсіда, зробленая ў форме трох-чатырохгранных выступаў. Уся прастора царквы – прытвор, алтар і апсіда – была пакрыта адным двухсхільным дахам з франтонам над апсідай, трансептам і прытворам. З левага боку знаходзілася рызніца, невялікае памяшканне пры алтарнай частцы, у якой захоўваліся царкоўныя рэчы.

План царквы ўяўляў сабой выцягнуты крыж. У месцы перакрыжавання знаходзіўся васьміgranны барабан з васьмю аконнымі праемамі, шатровым завяршэннем і невялікай галоўкай у форме цыбуліны. Вокны мелі класічную прамавугольную форму і былі аздоблены налічнікамі з франтонамі. Над прытворам узнімаўся другі барабан у форме чацверыка са схіленымі вугламі, з чатырма аконнымі праемамі, шатровым завершаннем і галоўкай-цыбулінай. Тут знаходзілася званіца, афарбаваная ў блакітны колер з зяленымі купаламі. Тэрыторыя царквы была абсаджана ліпамі ў два рады і абнесена драўлянай агароджай.



PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Звесткі аб унутранай прасторы не захаваліся. Пасля закрыцця царквы ў памяшканні доўгі час знаходзіўся мучны склад. У 1939 – 1940 гг. будынак быў разбураны.

Перад пасхай да Пакроўскай царквы з'язджаліся навакольныя сяляне. На ноч яны размяшчаліся прама на калесах ля царквы, палілі вогнішчы. Назаўтра – пасха, поп абыходзіў тры разы царкву, а над горадам басам гучаў звон Мікалаеўскага сабора і тэнарам – Пакроўскай царквы.

Зямля навокал належала царкве. Тут стаялі дамы папа і дзяка. Часткова яны захаваліся да нашага часу і даюць уяўленне аб пабудовах канца XIX – пачатку XX стст.

На месцы знесенай царквы нічога не было. Пасля вайны тут стварыўся спартыўны комплекс СШ №2.

### *Касцел у в. Застадолле*




"У Імперыі Расійскай" малюнак вучня 11 класа
з мастацкім ухілам СШ №2
Жудро Яўгена

Гэты помнік з'яўляецца адзіным каменным архітэктурным збудаваннем культавага дойлідства каталіцкай канфесіі, другі – больш значны і багацейшы ў Сянно быў знішчаны ў 1962 годзе.

Будынак касцёла ў вёсцы Застадолле па сучасны час невядомы даследчыкам і мастацтвазнаўцам архітыктуры Беларусі – звесткі аб ім адсутнічаюць у мастацтвазнаўчай літаратуры.

Касцёл пабудаваны ў класічным стылі пачатку XX стагоддзя. Будынак выцягнуты з усходу на захад. Фасад аздоблены чатырма тасканскімі калонамі. Касцёл мае трохвугольны каменны франтон, які да нашага часу не захаваўся, быў заменены на драўляны. Каменны франтон меў вялікае круглае вакно пад каньком даху, а над каньком існавала фігурная, каменая вежачка с крыжом. Цэнтральны масіў фасада падзелены на тры аднолькавыя часткі тасканскімі калонамі, якія маюць капітэль і трымаюць на сабе шырокую бэльку з дэнтыкуламі. Цэнтральны



PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

ўваход – прамавугольныя дзверы, зробленыя ў выглядзе плоскіх калон (пілястраў), выкананых у класічным стылі. Над парталамі з дзвярыма знаходзіцца шырокае паўкруглае вакно, аздобленае плоскім налічнікам. Дзве другія часткі фасаду паміж калонамі маюць у нізе фігурную, паўкруглую, вогнутую арку. Гэтыя аркі выконвалі ролю памяшкання для статуй, скульптурных фігур святых, якія там ставіліся. Скульптуры святых не захаваліся. Над аркамі размешчаны два прямавугольных картуша. З заходняга боку будынка ёсць паўкруглая апсіда, дзе знаходзіліся іконы. Алтар прарэзаны трыма паўкруглымі вокнамі. Па абодвух баках ад апсіды знаходзіліся сакрысты (памяшканні для святароў). Будынак быў атынкаваны ў белы колер, зараз моцна пашкоджаны. З розных бакоў адвалілася тынкоўка, знішчаны сакрысты, і дзе-нідзе заложаны вокны. Будынак шмат пацярпеў у гады Вялікай Айчанай вайны, доўгі час выкарыстоўваўся як склад піламатэрыялаў.

Будынак патрабуе неабходнай рэканструкцыі, як першы помнік культавай архітэктуры каталіцкай канфесіі на тэрыторыі сучаснага Сенненскага раёна. І, падкрэсліваю, касцёл у вёсцы Застадолле да сучаснага часу невядомы шырокаму колу даследчыкаў Беларусі.

## *Палац-сядзіба К. Свяцкага ў в. Беліца*




“Шляхецкая спадчына” малюнак вучня 11 класа з мастацкім ухілам СШ №2 Васіленка Мікалая



Сучасны выгляд палаца-сядзібы К. Свяцкага ў в. Беліца

Беліца адносілася да найбольш багатых двароў на Беларусі. У сярэдзіне XIX ст. яна належала Юзафу Свяцкаму, жонка яго была з роду Ваньковічаў, а потым да канца першай сусветнай вайны – яго сыну Каралю.

У сваім першапачатковым выглядзе абрыс будынка быў строга сіметрычным – у плане падоўжаны прамавугольнік. Аднапавярховы, ен толькі ў высунутай рызалітам сярэдняй частцы быў падвышаны яшчэ на адзін паверх, у галоўным фасадзе сярэдні рызаліт меў на першым паверсе прысценны порцік з галоўнымі дзвярыма і двума вокнамі з паўкруглым завяршэннем, флянкованы па баках парамі тасканскіх паўкалонаў. Верхні паверх аддзелены ад першага выступаючым карнізам, замыкаў трохвугольны шчыт з гербавым картушам уладароў. Фасад з



PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

боку сада быў сфарміраваны падобна да галоўнага. Толькі яго сярэдняя частка атрымала тут выгляд двухпавярховага паўкруглага рызаліту.

Палац быў пакрыты не вельмі высокім, гладкім двухсхільным дахам.

У 1907 – 1911 гг. да левага крыла К. Свяцкі дабудаваў двухпавярховую васьмівугольную вежу, звязаную з корпусам палаца пры дапамозе кароткага пераходу. Звонку ей быў нададзены значна багацейшы выгляд. Увесь першы паверх быў пакрыты рустам. Вежа была ўзбагачана порцікам з двума невялікімі калонамі і падтрымліваючымі яго высокімі сходамі, якія вядуць прама ў сад. Васьміскатны, вельмі сплюшчаны дах схаваны за невялікім выступам (атыкам), з агароджай.

Не вельмі разлеглы парк, які акружае дом з усіх бакоў, меў характар садоў пейзажных. Яго змыкаў квадрат алеі, абсаджаны ліпамі на старажытна-польскі ўзор. Ад пад’езда і ад процілеглых бакоў цягнуліся стрыжаныя газоны без дрэў з разбітымі па іх клумбамі.

Нажаль з-за варварства і безкультур’я гэты ўнікальны архітэктурны будынак быў амаль знішчаны. У 30-х гг. XX ст. у гэтым будынку размяшчаўся с/г тэхнікум, дзе вучылі на бугалтараў і арганомаў. Узначальваў будучы знакаміты партызанскі камандзір, герой СССР Лабанок.

### *Адміністрацыйны будынак*




“Пад мікалаеўскім наглядам” малюнак вучня 11 класа з мастацкім ухілам СШ №2 Шарэнда Дзяніса



Адміністрацыйны будынак. Фота 1961 г.

З другой паловы XVIII стагоддзя ў архітэктуры стаў пашырацца новы стыль – класіцызм. Далучэнне беларускіх зямель да Расіі супала з разгортваннем планіровачных работ у імперыі, што выклікала перапланіроўку населеных пунктаў. Першыя праекты ўпарадкавання планіроўкі былі распрацаваны і зацверджаны ў 1778 годзе і датычыліся Віцебска, Полацка, Оршы, Гарадка, Дрысы і Сянно. Пры перапланіроўцы асаблівая ўвага надавалася рэканструкцыі гарадскіх цэнтраў. Яны набывалі буйнамаштабны прасторавы характар. Галоўнымі кампанентамі забудовы станавіліся новыя адміністрацыйныя і грамадскія будынкі.

Больш хуткаму ажыццяўленню ансамблевай забудовы садзейнічалі тыповыя праекты. У плане гэтыя будынкі былі прамавугольныя, радзей – П-падобнай



PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

формы.  Выразна вылучаўся кампазіцыйны цэнтр – лесвічная клетка і вестыбюль. Пластыка фасадаў вызначалася прастатой і яснасцю форм. Такі ўзорны адміністрацыйны будынак  быў узведзены ў Сянно. Ён стаяў на месцы  сучаснага райвыканкама. У час вайны 1941 – 1945 гадоў ён быў часткова разбураны, але ў 1947 – 1948 гадах адноўлены.

Прамавугольны ў плане двухпавярховы будынак быў з вальмавым дахам. Адміністрацыйны буданак вызначаўся строгасцю кампазіцыі і стрыманасцю ў дэкаратыўнай апрацоўцы. Дзве гарызантальныя цягі паміж першым і другім паверхамі праходзілі па ўсім перыметры будынка. Галоўны фасад вылучаны рызалітам, у якім быў зроблены ўваход  камбінаваным атынам. Сцены першага паверха былі расшыты пад “дашчаты” руст, рытмічна раздзелены прамавугольнымі аконнымі праёмамі, на другім паверсе галоўнага фасада дэкарыраваны сандрынамі і простымі ліштвамі. Пад карнізамі – дэнтынулы.

Будынак – помнік грамадзянскай архітэктуры з выкарыстаннем элементаў класіцызму. Разбураны  помнік класіцызма ў 1976 годзе.

### *Панскі маентак у в. Задарожжа*



“Дваранскае гняздо” малюнак вучня 11 класа з мастацкім ухілам СШ №2 Няфедава Аляксея



Сучасны выгляд маентка ў в. Задарожжа

З даўніх часоў не шмат помнікаў архітэктуры каменнага дойлідства захавалася на тэрыторыі сучаснага Сенненскага раена. У асноўным жылыя сялібы будавалі з дрэва, бо гэта быў танны, шырока распаўсюджаны матэрыял. Звычайныя сялібы сялян больш-менш вядомы, а вось сялібы шляхты, памешчыкаў Сенненскага павета вядомыя менш. Гэта тлумачыцца тым, што ў часы рэвалюцыйных віхур шмат будынкаў было знішчана, а астатнія перароблены на іншы лад. Больш трывалымі былі будынкі буйных памешчыкаў, бо сродкі дазваляли будаваць іх з цэглы.

Адным з гэтых прыкладаў з’яўляецца панскі маентак у в. Задарожжа. У сучасны час прыстасаваны да школы. Панскі дом збудаваны ў пачатку XX ст. у класічным стыле, мае выразныя раздзяленні на чатыры часткі. Фасад упрыгожаны пласкімі калонамі-пілястрамі і дэйтыкуламі (пад дахам). Ганак багата аздоблены калонамі з каменымі ўпрыгажэннямі і фігурнымі карнізамі. Над ганкам узбагачаецца атык у выглядзе мезаніна з шырокім балконам. У сучасны час балкон



PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

заложаны цэглай. Чатыры часткі фасада праразаюць восем акон прамавугольнага тыпу з фігурнымі карнізамі. З тыльнага боку будынак меў драўляную галерэю і балкон.

Недалека ад будынка знаходзіўся жывапісны пруд, які зараз амаль знішчаны, і меўся сад.

Сам будынак пабудаваны ў выглядзе "цаглянай архітэктуры". Аб унутраным інтэр'еры дома гаварыць зараз не магчыма таму, што ен знік. Вядома толькі, што быў драўляны стол (сталешніца) і стул, якія зараз знаходзяцца ў музеі г. Сянно.

### *Яўрэйская лаўка ў г. Сянно*



Будынак яўрэйскай лаўкі Ізраэля Хітрыка.
Малюнак В.В. Бандарэвіча.

На месцы сучаснай гасцініцы быў гарадскі сад, у якім на агароджанай пляцоўцы, як сведчаць дакументы за 1902 г., два разы на тыдзень іграў духавы аркестр, праводзіліся харавыя спевы аматараў музыкі. Крыху далей знаходзіўся магазін пісьмовых тавараў Ізраэля Хітрыка, пабудаваны ў 1906 г. Гэта быў вельмі цікавы будынак, збудаваны ў яўрэйскім стылі, з цагляным фасадам і шасцівугольнымі зоркамі над ім. Потым тут размяшчаліся ашчадная каса, цырульня, сталоўка. У сувязі з будаўніцтвам гасцініцы магазін быў разбураны ў 1978 г.



PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com